Беларуская нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

## Заява

## Беларускай нацыянальнай платформы
## Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства

## з нагоды нечаканага вызвалення беларускіх палітычных зняволеных

*25 жніўня 2015 года*

Мы, арганізацыі грамадзянскай супольнасці, удзельнікі Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, вітаем рашэнне ўладаў аб вызваленні шасцярых беларускіх палітычных зняволеных: Міколы Статкевіча, Мікалая Дзядка, Яўгена Васьковіча, Ігара Аліневіча, Арцёма Пракапенкі, Юрыя Рубцова.

Беларуская нацыянальная платформа неаднаразова заклікала ўлады зрабіць гэты крок, і мы задаволеныя тым, што нашыя заклікі, нарэшце, былі пачутыя.

Расцэньваем гэта рашэнне як станоўчае для аздараўлення ўнутрыпалітычнай атмасферы, надання большага канструктыву ў знешнепалітычных стасунках нашай краіны, у першую чаргу — у стасунках з Еўрасаюзам у межах праграмы «Усходняе партнёрства».

Аднак, у той жа час, канстатуем, што дадзены крок не можа ўспрымацца як сведчанне паслядоўнай палітыкі і сістэмных змен, пакуль вызваленыя грамадзяне не атрымалі поўнай рэабілітацыі, а ў краіне застаецца магчымасць з’яўлення новых палітвязняў.

У сувязі з гэтым:

1. **Патрабуем і чакаем** ад уладаў поўнай рэабілітацыі ўсіх вызваленых былых палітвязняў, безумоўнага аднаўлення іх ва ўсіх грамадзянскіх правах;

2. **Выказваем заклапочанасць** у сувязі з існуючай сення пагрозаў з’яўлення новых палітвязняў: за кратамі знаходзяцца двое падазраваных па т.зв. «справе графіцістаў» — Максім Пекарскі і Вадзім Жэромскі могуць быць асуджаныя да пазбаўлення волі за нанясенне патрыятычных графіці, што, па ацэнке праваабаронцаў, з’яўляецца непрапарцыянальнай мерай пакарання за падобнае парушэнне;

3. **Заклікаем** следчыя органы да максімальнай празрыстасці ў «справе графіціcтаў», а таксама да вызвалення Максіма Пекарскага і Вадзіма Жэромскага, прынамсі, да адкрытага і празрыстага для грамадскасці судовага працэсу.